# Comparative analysis

# БЕЛАРУСЬ І ВЕНЕСУЭЛА. СПЕЦЫФІКА ВЫЖЫВАННЯ ДЗВЮХ АЎТАКРАТЫЙ

*Пётр Рудкоўскі*

Рэжым Аляксандра Лукашэнкі і чавісцкі рэжым у Венесуэле фармаваліся ў розных абставінах і шмат у чым адрозніваюцца. Аднак ёсць прынамсі чатыры прычыны, па якіх яны заслугоўваюць параўнальнага аналізу. Па-першае, абодва рэжымы паўсталі на фоне расчаравання эканамічнай лібералізацыяй і попыту на сацыяльна-ўраўняльную палітыку. Па-другое, абодва атрымалі перамогу над масавымі пратэстамі — у 2014 і 2017 гадах у Венесуэле і 2020 годзе ў Беларусі, але гэтая перамога мела сур'ёзныя пабочныя эфекты: рэжымы пагрузіліся ва ўнутраны крызіс і міжнародную ізаляцыю. Па-трэцяе, супраць абодвух рэжымаў заходнія краіны ўвялі жорсткія санкцыі. І нарэшце па-чацвёртае, у забеспячэнне выжывання абодвух рэжымаў была заангажавана Расія.

Такім чынам, у гэтым артыкуле параўнаем палітычныя працэсы ў Беларусі і Венесуэле, звяртаючы асаблівую ўвагу на стратэгіі выжывання рэжымаў у гэтых краінах. Пачнем ад абрысоўкі гістарычнага фону дзвюх аўтакратый і параўнання іх сістэмнай спецыфікі. Затым параўнаем пратэсты ў абедзвюх краінах. У выпадку Венесуэлы звернем на венесуэльскія пратэсты ў 2017 і 2024 гадах і на пратэсты 2020 года ў Беларусі. Таксама мы параўнаем спецыфіку рэпрэсій у абедзвюх краінах як метаду барацьбы з апазіцыяй і прадухілення пратэстаў.

## Гістарычны фон

Венесуэла — краіна з даволі доўгай гісторыяй незалежнасці, якая сягае пачатку 19 стагоддзя. Значную частку гэтай гісторыі характары-

завала дэмакратычная сістэма кіравання. Падчас як у другой палове 20-га стагоддзя ў Паўднёвай Амерыцы кіравалі або правыя ваенныя дыктатуры, або левыя аўтакратыі, Венесуэла была дэмакратыяй, толькі зрэдку сатрасаная сацыяльна-эканамічнымі крызісамі. Эканоміка краіны была і застаецца моцна залежнай ад даходаў ад экспарту нафты, а гэтыя даходы, у сваю чаргу, моцна залежаць ад зменлівых сусветных коштаў на нафту.

У канцы 1980-х і ў першай палове 1990-х урады Венесуэлы спрабавалі — у адпаведнасці з рэкамендацыямі Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) — правесці ліберальныя рэформы, якія павінны былі павялічыць здольнасць нацыянальнай эканомікі адаптавацца да зменлівых абставін і павысіць яе устойлівасць да знешніх узрушэнняў. Аднак тыповыя рэфармацыйныя дзеянні — дэрэгуляцыя, прыватызацыя і стымуляванне прадпрымальніцтва — спарадзілі сацыяльную напружанасць, што прывяло да павелічэння беспрацоўя, беднасці і пачуцця адчужэння ў многіх слаёў насельніцтва. Прыход да ўлады Уга Чавеса ў 1998 годзе, які запатрабаваў радыкальных зменаў у палітычнай сістэме, стаў магчымым дзякуючы назапашванню непрыязі да «неаліберальнай эканамічнай палітыкі», а таксама дзяржаў і інстытуцый, якія асацыяваліся з гэтай палітыкай (МВФ і заходнія краіны на чале з ЗША) .

Нягледзячы на выразныя аўтарытарныя схільнасці Уга Чавес не змог дэмантаваць дэмакратычныя інстытуты ў такой ступені, каб мець неабмежаваныя магчымасці ў ажыццяўленні дзяржаўнай улады. Апазіцыя заўсёды мела сваіх прадстаўнікоў у парламенце і мясцовых органах улады, выбары, хоць і не заўсёды празрыстыя і справядлівыя, былі канкурэнтнымі, а СМІ, у тым ліку электронныя, былі пераважна незалежнымі ад дзяржавы. Толькі пасля смерці Чавеса ў 2013 годзе, калі яго змяніў яго верны прыхільнік Нікалас Мадура, працэс аўтакратызацыі дзяржавы паскорыўся. У 2017 годзе The Economist Intelligence Unit (EIU) у сваім штогадовым індэксе дэмакратыі упершыню з пачатку маніторынгу класіфікаваў палітычную сістэму Венесуэлы як «аўтарытарны рэжым»1. Раней ён быў класіфікаваны як «гібрыдны рэжым».

У адрозненне ад Венесуэлы, Беларусь мае кароткую гісторыю незалежнасці: цалкам незалежнай дзяржавай яна стала толькі ў 1991 го-

[1] EIU складае Індэкс дэмакратыі з 2006 года.

дзе. Нягледзячы на тое, што перыяд з 1991 па 1994 гады характарызаваўся значна больш высокім узроўнем дэмакратыі, чым перыяд пасля 1994 года, не выпадае казаць пра той перыяд як час поўнай дэмакратыі. На палітычнай сцэне ўсцяж дамінавала посткамуністычная наменклатура, якая кантралявала ўрад, СМІ, сілавыя структуры і мела большасць у парламенце. Гэта была не столькі дэмакратычная сістэма, колькі гібрыдная.

Падабенства паміж Беларуссю і (чавісцкай) Венесуэлай пачынаецца ў момант, калі ў 1993-1994 гадах Лукашэнка, які тады быў дэпутатам і старшынёй парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй, пачаў сваю прэзідэнцкую кампанію. Як і Чавес, Лукашэнка ганьбіў прыватызацыю, капіталізм і «жулікаў» (так ён называў тагачасных бізнэсоўцаў), а таксама заходнія краіны, якія на чале з ЗША ўсё гэта прасоўваюць. Як і ў Венесуэле, такая рыторыка трапіла на спрыяльную глебу: значная частка грамадства, змагаючыся з інфляцыяй, высокімі коштамі, беспрацоўем і нізкімі заробкамі, ахвотна падтрымала «свайго мужыка». У Венесуэле такім «мужыком» быў Чавес, у Беларусі — Лукашэнка. Абодва прыйшлі да ўлады праз дэмакратычныя выбары, на якіх атрымалі ўпэўненую перамогу: у другім туры ў 1994 годзе Лукашэнка набраў 80,6% галасоў пры яўцы 70,6%, а Чавес у 1998 годзе выйграў ужо ў першым туры, набраўшы 56,2% галасоў пры яўцы 63,5%.

У Беларусі, дзе дэмакратычныя інстытуты былі ў зародку, Лукашэнку спатрэбілася ўсяго два гады, каб усталяваць аўтарытарную ўладу. З моманту ўнясення змяненняў у Канстытуцыю ў лістападзе 1996 года, якія фактычна скасавалі падзел дзяржаўных уладаў і ўсталявалі суперпрэзідэнцкую палітычную сістэму, Беларусь функцыянуе ў якасці кансалідаванай аўтакратыі. У парламенце і мясцовых саветах, палітычная вага якіх пасля 1996 года і так стала нікчэмнай, доля апазіцыянераў вагалася паміж 0% і 1%. Дзяржаўныя СМІ былі цалкам падпарадкаваныя палітычнаму кантролю, а недзяржаўныя былі альбо зачыненыя, альбо моцна абмежаваныя. За больш чым 25 гадоў не было ніводнага мэра і ніводнага мясцовага савета, якія б занялі апазіцыйную пазіцыю. З 2001 года выбары і рэферэндумы ў Беларусі рэгулярна фальсіфікуюцца, і цяжка тут казаць аб існаванні якой-кольвечы палітычнай канкурэнцыі.

# Спецыфіка палітычнага ладу

Да 2018 года агульны паказнік дэмакратыі ў дзвюх краінах выразна адрозніваўся (гл. графік 1).

**Графік 1. Агульны паказнік дэмакратыі (шкала ад 0 да 100)**




Крыніца: EIU

Адрозненні становяцца яшчэ больш яскравымі, калі глянем на некаторыя параметры дэмакратыі, асабліва на «плюралізм і выбарчы працэс». Розніца ў гэтым плане доўгі час была каласальная: да 2016 года ўзровень плюралізму і выбарчага працэсу ў Венесуэле ён быў у сярэднім у тры разы вышэйшы за той, што быў у Беларусі — гл. графік 2.

Толькі з 2017 года, калі прэзідэнт Нікалас Мадура зрабіў спробу замяніць парламент створаным пад наглядам яго службаў Установчым сходам, эрозія выбарчых інстытутаў і палітычная канкурэнцыя імкліва прагрэсуюць. Пачынаючы з 2019 года з-за сур’ёзных сумневаў наконт законнасці студзеньскай прэзідэнцкай інаўгурацыі Мадуры, ўзровень выбарчага працэсу і плюралізму быў ацэнены экспертамі EIU на 0. Гэта быў адзіны момант у гісторыі, калі індэкс выбарчага працэсу і плюралізму ў Беларусі быў вышэйшы, чым у Венесуэле (10 супраць 0). У 2020 годзе гэты паказнік для абедзвюх краін зраўняўся і склаў 0; такім і застаўся ў наступныя гады.

**Графік 2. Выбарчы працэс і плюралізм (шкала ад 0 да 100)**




Крыніца: EIU

Да 2017 года краіны таксама адрозніваліся па двух іншых паказніках: палітычнага ўдзелу і ўзроўню грамадзянскіх свабод, хоць і не так радыкальна, як у выпадку з выбарчым працэсам і плюралізмам. Да 2010 года ўзровень палітычнага ўдзелу ў Венесуэле быў амаль удвая вышэйшы, чым у Беларусі; у 2011–2017 гадах разрыў крыху скараціўся, але Венесуэла па-ранейшаму апярэджвала свайго еўрапейскага саюзніка ў паўтара раза.

З 2018 года, на фоне агульнай эрозіі дэмакратыі ў Венесуэле, паказнікі палітычнага ўдзелу абедзвюх краін пачалі збліжацца, пакуль у 2021 годзе не сталі аднолькавымі: 39/100. У наступныя два гады у Беларусі гэты паказнік яшчэ больш знізіўся; у Венесуэле ж у 2023 годзе быў адзначаны невялікі рост. У выпадку з грамадзянскімі свабодамі ў Венесуэле з 2017 года назіраецца бесперапыннае пагаршэнне, у той час як у Беларусі пасля сямі гадоў захавання даволі кепскага стану негатыўная дынаміка аднавілася ў 2020 годзе (гл. графікі 3 і 4).

Значна меншыя адрозненні паміж Венесуэлай і Беларуссю ёсць яшчэ па двух параметрах: функцыянаванне ўлады і палітычная культура. Назва апошняй катэгорыі («палітычная культура») можа ўводзіць у зман: гаворка ідзе не пра ўзровень палітычнай культуры элітаў, а пра ўзровень прадэмакратычных настрояў у грамадстве.

**Дыяграма 3. Палітычны ўдзел**




Крыніца: EIU

**Графік 4. Грамадзянскія свабоды**




Крыніца: EIU

Індэкс функцыянавання ўрада для абедзвюх краін быў адносна нізкім на працягу ўсяго перыяду маніторынгу EIU (2006–2022): ён ніколі не перавышаў 43 у Венесуэле і 39 у Беларусі. У абедзвюх краінах з 2014 года назіраецца паступовы трэнд на зніжэнне — гл. графік 4. Мінімальнымі з'яўляюцца таксама адрозненні ў выпадку г.зв палітычнай культуры. Аднак гэта адзіны параметр, сярэдні паказчык па Беларусі хоць і нязначна, але вышэйшы за сярэдні па Венесуэле — гл. графік 6.

**Графік 5. Функцыянаванне ўрада**




Крыніца: EIU

**Графік 6. Палітычная культура**




Крыніца: EIU

# Пратэсты і рэпрэсіі

Як адзначалася вышэй Чавес і Лукашэнка прыйшлі да фоне сацыяльна-эканамічных праблем. Абодва прапанавалі даволі падобны сацыяльны кантракт: пераразмеркаванне дабротаў для памяншэння сацыяльнай няроўнасці ў абмен на згоду на аўтарытарнае кіраванне.

Навязаны венесуэльскаму і беларускаму грамадствам сацыяльны кантракт выклікаў супраціў часткі грамадства, што вылівалася ў пратэсты. Частата і інтэнсіўнасць пратэстаў у дзвюх краінах была рознай. У Венесуэле адразу пасля прыходу Чавеса да ўлады ў 1998 годзе актыўнасць грамадскага пратэсту прыкметна актывізавалася: з 1999 па 2019 гады масавыя антыўрадавыя выступы ўспыхвалі літаральна кожны год. Аднак з 2019 года пратэстная актыўнасць венесуэльцаў зніжаецца, а ў 2021 годзе ўпала да ўзроўню перад прыходам да ўлады Чавеса. Цягам двух наступных гадоў яна нязначна ўзрасла.

У Беларусі частата і інтэнсіўнасць пратэстаў у цэлым былі меншымі. У адрозненне ад чавісцкай Вэнэсуэлы, у лукашэнкаўскай Беларусі масавыя акцыі пратэсту былі радзейшымі і адбываліся ў асноўным з нагоды прэзыдэнцкіх выбараў (гл. графік 7).

**Графік 7. Прадэмакратычная мабілізацыя (шкала ад 0 да 4)**




Крыніца: V- Dem

У Венесуэле пратэсты супраць рэжыму чавістаў дасягнулі піку ў 2017 годзе, калі пасля роспуску парламента, дзе дамінавала апазіцыя, каля 6 мільёнаў венесуэльцаў (больш за 20% насельніцтва) прынялі ўдзел у антыўрадавых дэманстрацыях. У Беларусі пік пратэстнай актыўнасці прыпаў на другую палову 2020 года. Пратэсты пачаліся

ў чэрвені пасля першых арыштаў палітычных апанентаў Лукашэнкі падчас выбарчай кампаніі, а пасля грубай фальсіфікацыі выбараў і гвалту з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў непамерна ўзмоцніліся. У жніўні, паводле розных ацэнак, у дэманстрацыях супраць рэжыму Лукашэнкі ўзялі ўдзел ад 300 тысяч да мільёна беларусаў (4-11% насельніцтва).

Як рэжым Мадуры, так і рэжым Лукашэнкі рэгулярна ўжываюць рэпрэсіі супраць палітычных апанентаў і ўдзельнікаў пратэстаў. Сістэма рэпрсій, аднак, адрозніваецца. Падчас як у Беларусі рэпрэсіі — за невялікімі выключэннямі — інтэграваныя ў сістэму аховы грамадскага парадку, то ў Венесуэле яны адбываюцца двума спосабамі: як частка сістэмы аховы грамадскага парадку і як частка дзейнасці нефармальных ваенізаваных груповак.

Цягам пяці гадоў (2017–2021) у Венесуэле з-за пратэстнай актыўнасці загінула больш за 200 чалавек, каля 15 тыс. атрымалі раненні, каля 6 тыс арыштаваны. Да гэтага трэба дадаць сістэматычныя спробы запалохвання, абмежавання свабоды слова і сходаў і публічнай стыгматызацыі апазіцыі. Арыштаваныя часта падвяргаюцца катаванням і знявагам. У той час як арышты і палітычна матываваныя прысуды адбываюцца паводле першага трэку (дзейнасць органаў дзяржбяспекі), то ў выпадку забойстваў, выкраданняў ці калецтваў галоўную ролю адыгрываюць праўладныя баевікі, г.зв. collectivos.

У Беларусі да 2020 году маштабы гвалту супраць апанэнтаў рэжыму былі значна меншыя, чым у Вэнэсуэле. Акрамя чатырох «палітычных знікненняў» у 1999 і 2000 гадах, якія, хутчэй за ўсё, былі забойствамі, рэпрэсіі складаліся пераважна з прэвентыўных абмежаванняў свабоды слова і сходаў, штрафаў, кароткатэрміновых арыштаў і стыгматызацыі апазіцыі. Жорсткае збіццё ці катаванні былі хутчэй выключэннем, чым правілам.

Сітуацыя кардынальна змянілася ў 2020 годзе. Падчас падаўлення пратэстаў або ў выніку катаванняў у турмах загінулі каля 15 удзельнікаў пратэстаў. Сюды ж варта дадаць аднаго чалавека, які скончыў жыццё самагубствам з-за здзекаў і катаванняў з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў і аднаго чалавека, які загінуў у перастрэлцы з супрацоўнікамі КДБ, якія незаконна спрабавалі ўварвацца ў яго прыватную кватэру.

Ужо ў верасні 2020 года Упраўленне ААН па правах чалавека выявіла 450 задакументаваных выпадкаў катаванняў і жорсткага

абыходжання з арыштаванымі пратэстоўцамі ў Беларусі. Паводле звестак праваабарончай арганізацыі «Вясна», колькасць палітвязняў на пачатак красавіка 2024 года склала 1402 чалавекі (адзін з іх — сулаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Алесь Бяляцкі). Калі дадаць колькасць тых, хто ўжо выйшаў з месцаў пазбаўлення волі, то атрымаецца 3100 чалавек.

Варта дадаць, што не кожны арыштаваны па палітычных матывах афіцыйна прызнаны палітвязнем, бо не заўсёды адпаведная інфармацыя даходзіць да згаданай арганізацыі. З палітвязнямі ў месцах пазбаўлення волі абыходзяцца таксама больш жорстка, таму такія зняволеныя ці іх сем'і не заўсёды хочуць, каб іх публічна прызнавалі «палітычнымі». Такім чынам, рэальная колькасць палітвязняў значна большая, чым паказваецца ў афіцыйных справаздачах арганізацыі «Вясна».

## Падагульненне

Як рэжым Лукашэнкі ў Беларусі, так і рэжым чавістаў у Венесуэле на этапе свайго паўстання былі левымі папулісцкімі палітычнымі ўтварэннямі. З цягам часу яны трансфармаваліся ў аўтакратыі, якія ўсё больш і больш аддаляліся ад народа, але па-ранейшаму прэтэндавалі на права выключнага яго прадстаўніцтва.

Беларусь стала аўтарытарнай краінай у 1996 годзе, то бок на трэці год кіраваньня Лукашэнкі. Венесуэла — толькі ў 2017 годзе. Аднак з самага пачатку абодва рэжымы звярталіся да пазаправавых метадаў пацыфікацыі грамадства: адвольных арыштаў, катаванняў і забойстваў. З 2017 года ў Венесуэле і з 2020 года ў Беларусі ўзмацняюцца рэпрэсіі, і прастора свабоды, і без таго даволі вузкая на папярэдніх этапах, рэзка звужаецца.

Нягледзячы на тое, што чавізм доўгі час функцыянаваў як гібрыдны рэжым (канкурэнтны аўтарытарызм), ён у цэлым быў больш рэпрэсіўны, чым беларускі, калі параўноўваць яго з сітуацыяй пасля 2020 года. Гэта звязана з тым, што рэпрэсіўны апарат у Беларусі ў асноўным інтэграваны ў дзяржаўныя структуры: дзяржава мае абсалютную манаполію на прымяненне гвалту, тымчасам у Венесуэле значную ролю ў рэпрэсіях адыгрываюць паралімітаваныя фармаванні.